# НАПРАЦАВАНЫ ВОПЫТ І НОВАЯ АТМАСФЕРА

**Беларусь прапаноўвае Ірану аднавіць ранейшы высокі ўзровень узаемадзеяння, у тым ліку гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага.**

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй сходу ісламскага савета Ісламскай Рэспублікі Іран Алі Ларыджані.

«Іран мы заўсёды разглядалі як перспектыўнага партнёра для супрацоўніцтва. Больш за тое, у нас былі і ёсць вельмі цесныя сяброўскія адносіны», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён дадаў, што Беларусь і Іран дасягнулі пэўных вынікаў у эканамічнай сферы, ва ўзаемным тавараабароце.

Разам з тым, Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на зніжэнні ўзроўню кантактаў, паведамляе БЕЛТА. Ён лічыць, што ёсць аснова для выхаду ўзаемадзеяння на самы высокі ўзровень з улікам існуючага вялікага вопыту двухбаковага супрацоўніцтва. «Лічу, што няма неабходнасці гаварыць пра нашы магчымасці, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Вы добра ведаеце Беларусь, мы — Іран. Магчымасці і ў нас, і ў вас каласальныя».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь зацікаўлена ў іранскіх інвестыцыях. «Хацелася б, каб тут было больш руху, каб вы ў цэнтры Еўропы дэманстравалі ўсім, што Іран ёсць, ён не проста жывы, ён будзе доўга жыць і на злосць нашым ворагам будзе квітнець». Акцэнтуючы ўвагу на важнасці беларуска-іранскіх праектаў, якія ажыццяўляюцца ў Беларусі, у тым ліку інвестыцыйных, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Гэта выгадныя праекты, і яны акупяцца».

# НЕ ГОРШ, ЧЫМ У АТЭЛЯХ

**Федэрацыя прафсаюзаў гатова размясціць каля 1 тысячы гасцей і ўдзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі на базах вакол Мінска. Аб гэтым Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку далажыў старшыня ФПБ Леанід КОЗІК.**

Леанід Козік паведаміў, што ФПБ выканала даручэнне Прэзідэнта і падрыхтавала свае базы ў наваколлі Мінска для прыняцця гасцей чэмпіянату. Тут змогуць размясціцца каля 1 тысячы чалавек. Па словах старшыні Федэрацыі прафсаюзаў, гэтыя аб'екты па наборы паслуг, якія прадастаўляюцца, практычна нічым не адрозніваюцца ад сучасных гасцініц. Госці і ўдзельнікі ЧС, якія будуць пражываць у санаторыях, змогуць пры жаданні атрымаць дадатковае лячэнне, як і іншыя пастаяльцы.

Прэзідэнт падзякаваў прафсаюзам «за спакойную, ціхую, ненавязлівую работу па арганізацыі выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў», а таксама папрасіў далажыць аб сітуацыі ў прафсаюзным руху, праблемных пытаннях, на якія неабходна звярнуць увагу. Старшыня ФПБ адзначыў, што сітуацыя ў цэлым нармальная. У краіне працуюць 23 тысячы прафсаюзных арганізацый, якія ведаюць настрой людзей, іх праблемы і пажаданні.

Размова таксама ішла аб санаторна-курортным лячэнні, дзіцячым аздараўленні. Як далажыў Леанід Козік, у санаторыях каля паловы адпачывальнікаў — гэта замежныя грамадзяне, перш за ўсё з Расійскай Федэрацыі, якія задаволены як умовамі, так і медыцынскім абслугоўваннем. Паводле яго слоў, беларускія санаторыі загружаны на 100% круглы год. Што тычыцца дзіцячага аздараўлення, то плануецца, што сёлета ў дзіцячых лагерах адпачнуць 345 тысяч дзяцей. Кошт пуцёўкі для бацькоў не перавысіць 10% ад яе агульнага кошту. ФПБ выдзеліла сродкі для кожнай вобласці, якія будуць накіраваны на патанненне пуцёвак для дзяцей са шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў, паведамляе БЕЛТА.

■ Лепшыя з лепшых

# ПАВЕЛІЧЭННЕ ЭКСПАРТУ ЗА КОШТ ЯКАСЦІ

## Узнагароджаны пераможцы конкурсу на суісканне Прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці 2013 года

Фота БЕЛТА.

**Учора ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на суісканне Прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці. За 15 гадоў лаўрэатамі сталі 189 арганізацый і прадпрыемстваў, паведаміў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір СЯМАШКА. Сёлета дыпломы атрымалі 13 прадпрыемстваў, якія ўпершыню сталі лаўрэатамі прэміі, 6 арганізацый — паўторна, а дзве — удастоены звання дыпламанта. «Яны крыху не дацягнулі, каб стаць лаўрэатамі, але мы палічылі патрэбным іх таксама адзначыць», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.**

Паляпшэнне якасці айчыннай прадукцыі і паслуг з'яўляецца адным з элементаў дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Уладзімір Сямашка ўпэўнены, што гандляваць на сусветным рынку цяпер можна толькі сапраўды якасным таварам. Тым больш што за апошнія 10 гадоў доля прамысловай вытворчасці Беларусі павялічылася ў 2,3 раза. Каля 65% айчыннага прадукту прадаецца за мяжу. Таму сёння барацьба за якасць стала патрабаваннем эканамічнага жыцця краіны.

У конкурсе традыцыйна ўдзельнічаюць прамысловыя прадпрыемствы, арганізацыі сферы паслуг, адукацыі, транспартнай галіны, будаўніцтва і энергетыкі. Прыкладна палова сёлетніх лаўрэатаў дзейнічае ў сферы паслуг, якая мае для нас вельмі важнае значэнне, бо яна працуе не толькі на карысць народа, але і стварае пэўны экспартны патэнцыял. У гэтым годзе мы павінны паставіць на экспарт прадукцыі і паслуг больш чым на 60 млрд долараў (на 9% больш за леташні аб'ём).

Гаворачы аб умовах правядзення конкурсу, Уладзімір Сямашка паведаміў, што яны распрацоўваліся з улікам вопыту правядзення такіх конкурсаў у краінах Еўрасаюза. Крытэрыі ацэнкі ўдзельнікаў адлюстроўваюць сусветныя тэндэнцыі. Гэта ў першую чаргу тычыцца канкурэнтаздольнасці тавараў па ўсіх параметрах. Улічваўся агульны ўзровень арганізацыі вытворчасці, дзе разглядаўся ў тым ліку аспект тэхнікі бяспекі і прамысловай санітарыі. Акрамя таго, пры падвядзенні вынікаў конкурсу ўпор рабіўся на нарошчванне прадпрыемствамі экспартнага патэнцыялу. Першы віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што ў перыяд інавацый айчынная эканоміка патрабуе ўкладання ў развіццё прамысловасці і бізнесу буйных інвестыцый. Толькі ў гэтым выпадку цяпер можна дасягнуць неабходных поспехаў пры прасоўванні беларускіх тавараў і паслуг за межы краіны. Гэта праца, на думку Уладзіміра Сямашкі, асабліва актуальная ў сувязі са стварэннем Мытнага саюза, уваходжаннем Беларусі ў АЭП і тым, што Расія, якая з'яўляецца асноўным рынкам збыту для нас, стала членам Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

**Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА** паведаміў, што плануецца прыцягнуць да ўдзелу ў такім конкурсе прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу. Справа ў тым, што ўжо цяпер многія падобныя прадпрыемствы дэманструюць дастаткова высокія паказчыкі якасці і канкурэнцыі. Сёння камітэт імкнецца матываваць да ўдзелу ў конкурсе большую колькасць прадпрыемстваў. «Галоўнае, каб у краіне была не проста вялікая колькасць паспяховых прадпрыемстваў, але каб уся прамысловасць краіны займалася пытаннямі якасці. Такую задачу мы павінны вырашыць паўсюдна, практычна на любым прамысловым прадпрыемстве, пры арганізацыі сферы паслуг, будаўніцтве і гэтак далей», — лічыць кіраўнік Дзяржстандарта.

На цырымоніі таксама былі адзначаны нагрудным знакам «Лідар якасці» кіраўнікі шэрагу прадпрыемстваў, якія дасягнулі найвышэйшых вынікаў у галіне якасці прадукцыі (паслуг) і сістэмнага менеджменту, уручаны дыпломы пераможцам конкурсаў «Лепшы менеджар па якасці» і «Лепшая дыпломная і навукова-даследчая работа студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці» 2013 года.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Супраць залежнасці

# ЭНТУЗІЯСТЫ-ЦВЯРОЗНІКІ

## У краіне дзейнічаюць 70 груп ананімных алкаголікаў

**Алкагалізм нездарма называюць сацыяльным захворваннем: людзі выкарыстоўваюць спіртное ў якасці ўніверсальнага антыдэпрэсанту і запаўняльніка маральнай пустаты. Па інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, у Беларусі на яго хварэюць (толькі па афіцыйнай статыстыцы) 170 тысяч чалавек, а яшчэ прыкладна палова ад гэтай колькасці стаіць на прафілактычным уліку. Увогуле ж атрымліваецца, злоўжываюць алкаголем 250 тысяч чалавек — насельніцтва вялікага горада.**

Спосабаў лячыць хваробу шмат. Адзін з іх — гэта збор колішніх сабутэльнікаў не для таго, каб у чарговы раз «скінуцца на траіх», а падзяліцца сіламі і ўласным вопытам. Такой тактыкі прытрымліваецца таварыства ананімных алкаголікаў, супрацоўнікі Офіса якога згадзіліся пагутарыць з карэспандэнтам «Звязды». Па вядомых прычынах іх імёны не называюцца.

### ХТО ТАКІЯ АНАНІМНЫЯ АЛКАГОЛІКІ?

«Гэта цалкам добраахвотнае сусветнае таварыства, якое аб'ядноўвае мужчын і жанчын розных узростаў, сацыяльнага статусу, узроўню адукацыі, якія збіраюцца для таго, каб пастаянна падтрымліваць стан цвярозасці. Жаданне кінуць піць і ёсць галоўная ўмова членства. Удзельнікі таварыства не плацяць якіх-небудзь узносаў. Мы не атрымліваем грашовай і рэчавай дапамогі з-за мяжы, не бяром ахвяраванняў ад людзей, якія не ўваходзяць у таварыства. Усё фінансаванне адбываецца выключна на добраахвотнай аснове, грошы ахвяруюць удзельнікі. Мэта нашай дзейнасці — заставацца цвярозымі і дапамагаць іншым алкаголікам займець здаровы цвярозы лад жыцця. Мы не адносімся да якіхсьці рэлігійных арганізацый, палітычных груповак...

Механізм нашага функцыянавання просты. Таварыства ў кожнай краіне складаецца з асобных груп. Між іншым, іх у свеце налічваецца каля 125 тысяч — а гэта 2-3 мільёны чалавек. Дакладнай лічбы назваць нельга, бо гэтая статыстыка не вядзецца наўмысна. Колькасць людзей у групе, якія збіраюцца для таго, каб падзяліцца вопытам, таксама жорстка не рэгламентуецца. Галоўнае, каб іх было мінімум два. У Беларусі ж працуюць 70 груп ананімных алкаголікаў, з іх толькі ў Мінску — 24. Прыходзілі да нас і юнакі, і людзі ва ўзросце за 60».

### ЯК ЧЛЕНЫ ТАВАРЫСТВА ДАПАМАГАЮЦЬ АДНО АДНАМУ?

«Галоўнае, каб чалавек пераадолеў страх і сказаў сабе: «Так, я залежны ад алкаголю. Але не хачу больш піць — дапамажыце мне вылезці з гэтай багны». Бо галоўныя прынцыпы нашай працы, акрамя ананімнасці, — гэта шчырасць і добрасумленнасць не толькі перад людзьмі навокал, але і перад самім сабой. Зразумела, што праграма таварыства ананімных алкаголікаў прадугледжвае стапрацэнтнае адмаўленне ад выпіўкі. Цвярозасць дасягаецца на аснове праграмы дзеянняў «Дванаццаць крокаў». Накіравана яна не толькі на культывацыю ў свядомасці такіх маральных якасцяў, як адказнасць, сумленнасць, дысцыплінаванасць, карыснасць, але і на «інвентарызацыю» этапаў свайго жыцця. Дасягаецца гэта тым, што адзін алкаголік непасрэдна гутарыць з другім.

Члены таварыства рэгулярна збіраюцца на сустрэчах, якія бываюць закрытымі і адкрытымі. У першых могуць удзельнічаць толькі тыя людзі, якія пакутуюць на залежнасць ад алкаголю. На адкрытыя сустрэчы могуць прыходзіць і тыя, хто хоча пераняць вопыт ананімных алкаголікаў у дасягненні цвярозасці. Ананімнасць — бадай што галоўны і важнейшы крытэрый абароны для навічка. У яго тут не спытаюць пашпартных даных, не паставяць на ўлік у наркалагічным аддзяленні, не зарэгіструюць, не паведамяць на працу».

### ЯК ВЫГЛЯДАЮЦЬ СТАСУНКІ АНАНІМНЫХ АЛКАГОЛІКАЎ З РАЗНАСТАЙНЫМІ ГРАМАДСКІМІ СТРУКТУРАМІ?

«Мы не ўваходзім у іх склад, хаця з імі супрацоўнічаем. Мы не займаемся пастаноўкай дыягназаў, але пры гэтым у нас наладжаны добрыя кантакты з медыцынскімі работнікамі. Напрыклад, гэта праяўляецца тады, калі стаіць пытанне аб неабходнасці шпіталізацыі чалавека. Актыўна супрацоўнічаем з Дэпартаментам па выкананні пакаранняў МУС Беларусі — наведваем лячэбна-працоўныя прафілакторыі і папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу — так званыя «хіміі». Ідуць нам насустрач і адміністрацыі некаторых раёнаў, дзе сітуацыя з алкаголем проста катастрафічная».

### ЧАГО НЕ РОБІЦЬ ТАВАРЫСТВА?

«Мы не захоўваем якіясьці запісы аб нашых удзельніках і не займаемся іх уцягненнем у нашы рады. Ніякага кантролю за нашымі членамі не вядзецца. Мы не ставім дыягназаў і не прымаем ніякай аплаты за свае паслугі. Часта нас блытаюць з арганізацыямі сацыяльнага кірунку. Але мы не забяспечваем людзей жыллём, харчаваннем, адзеннем, працай, грашыма...»

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

# АБ'ЯЎЛЕНЫ КОНКУРС «ЛЕПШЫЯ ТАВАРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА РЫНКУ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ»

**Чарговы, чатырнаццаты, конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі» арганізуецца з мэтай павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, стварэння добрай рэпутацыі беларускіх тавараў на расійскім рынку.**

Конкурс праводзіцца ў рамках Саюзнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, Праграмы «100 лепшых тавараў Расіі» з 2001 года. Удзельнічаць у ім могуць юрыдычныя асобы, незалежна ад формаў уласнасці, і індывідуальныя прадпрымальнікі, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку.

Вылучэнне прадукцыі праводзіцца па наступных намінацыях: харчовыя тавары, прамысловыя тавары для насельніцтва, вырабы народных і мастацкіх промыслаў, прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння, паслугі.

Усе тавары прымаюцца да разгляду пры ўмове іх пастаўкі ў Расійскую Федэрацыю на працягу не меней за адзін год.

Арганізацыі, якія жадаюць удзельнічаць у конкурсе, падаюць да 15 ліпеня 2014 года заяўку і камплект дакументаў у сакратарыят Камісіі па падвядзенні вынікаў конкурсу, што сфарміраваны пры Дзяржстандарце Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыі, тавары якіх удастоены звання лаўрэата конкурсу, узнагароджваюцца дыпломам і атрымліваюць права размяшчэння знака (лагатыпа) конкурсу на тавары і яго ўпакоўцы, этыкетцы (ярлыку), а таксама выкарыстання яго ў дакументацыі і рэкламных матэрыялах.

Звесткі аб таварах-лаўрэатах і іх вытворцах размяшчаюцца на сайце Дзяржстандарту і Праграмы «100 лепшых тавараў Расіі», а таксама ў каталогу Праграмы «100 лепшых тавараў Расіі», які рассылаецца ў органы дзяржаўнага кіравання Расійскай Федэрацыі, іншыя зацікаўленыя арганізацыі.

Падрабязная інфармацыя аб конкурсе размешчана на інтэрнэт-сайце Дзяржстандарту (www.gosstandart.gov.by/Конкурсы в области качества).

**Святлана БУСЬКО.**